УДК 821.161

**_В.А. Буднік_**
*магістр філал. навук, выкладчык каф. беларускай і рускай моў*
*Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта*
e-mail: budnik84@bk.ru

# АПАВЯДАННІ І. ПТАШНІКАВА 1950-х гг.: КАНЦЭПЦЫЯ ГЕРОЯ, НАРАТЫЎНЫЯ АДМЕТНАСЦІ

*Развіццё мастацкай індывідуальнасці пісьменніка звязана з жанрам апавядання, якое давала магчымасць І. Пташнікаву скацэнтраваць увагу на адным персанажы, глыбока і поўна выявіць яго ўнутраны свет. Выкарыстанне ўнутраных маналогаў, няўласна-простага маўлення, мастацкай дэталі, экспрэсіўнасці героя і апавядальніка вызначаюць наратыўныя адметнасці апавяданняў І. Пташнікава.*

## Уводзіны

Іван Пташнікаў прыйшоў у літаратуру ў канцы 1950-х гг., у час вялікіх пераўтварэнняў і змен ва ўсіх сферах савецкага грамадскага жыцця, якія былі звязаны з асуджэннем таталітарнага рэжыму і культу асобы Сталіна. Творчае станаўленне празаіка адбывалася на хвалі дэмакратычнага грамадскага ўздыму сярэдзіны 60-х гг. XX ст. Творцы ў тых умовах атрымалі магчымасць выяўляць свае погляды і ацэнкі больш адкрыта і поўна, чым у папярэднія дзесяцігоддзі. Фарміраванне творчай асобы І. Пташнікава адбывалася не толькі ў адноўленай грамадскай і духоўнай атмасферы, але і на багатай нацыянальна-эстэтычнай аснове. У гэты час пачынаюць вяртацца ў літаратуру імёны і творы многіх рэпрэсаваных беларускіх пісьменнікаў. Сярод іх М. Гарэцкі, Я. Пушча, У. Дубоўка, Ц. Гартны. Пачынаюць перакладацца, станавіцца даступнымі шырокаму колу чытачоў творы сусветна вядомых замежных майстроў слова. Выходзілі асобнымі кнігамі, друкаваліся ў часопісах творы Э. Хэменгуэя, А. Сент-Экзюперы, Г. Бёля, Д. Джойса, М. Пруста, Ф. Кафкі. Тагачаснае маладое пакаленне беларускіх пісьменнікаў мела больш спрыяльныя ўмовы для выяўлення творчых магчымасцей і таленту. Гэты час у беларускім літаратурным працэсе адзначаны з'яўленнем непаўторных творчых індывідуальнасцей: М. Стральцоў, І. Пташнікаў, У. Караткевіч, Г. Бураўкін і інш. Усе яны, зусім не падобныя ў сваім творчым абліччы, прыйшлі ў літаратуру ў перыяд дэмакратызацыі.

Сацыякультурныя змены, што адбываліся на вёсцы, па-мастацку зацікаўлена асэнсоўваліся літаратурай, асабліва такімі вядомымі расійскімі і беларускімі пісьменнікамі, як Я. Мальцаў, М. Аляксееў, П. Праскурын, С. Круцілін, Я. Дораш, А. Кулакоўскі, А. Асіпенка, М. Лобан, А. Чарнышэвіч, І. Мележ, І. Шамякін і інш. Адначасова з'яўляліся творы і маладзейшых пісьменнікаў – Ф. Абрамава, В. Шукшына, В. Астаф'ева, В. Распуціна, Я. Носава, В. Адамчыка, Б. Сачанкі, І. Пташнікава. Іх апавяданні і невялікія аповесці атрымалі ў крытыцы назву «вясковай прозы» – тэматычна-стылявога напрамку пераважна лірычнай танальнасці. Такім чынам, разам з літаратурай, якая ішла за зменлівай вясковай рэчаіснасцю і старалася адлюстраваць яе дынаміку, з'явілася літаратура «вяртання да вёскі», да герояў з вёскі. Тэма вёскі, атрымаўшы глыбокае асвятленне і нацыянальна-філасофскую змястоўнасць, станавілася галоўным аб'ектам мастацкага даследавання ў творчасці многіх пісьменнікаў.

Абвостраная ўвага беларускіх празаікаў да вясковай тэмы грунтавалася на традыцыях нацыянальнай літаратуры 20-х гг. XX ст. – на творах Я. Коласа, М. Гарэцкага, К. Чорнага, Л. Калюгі, М. Зарэцкага і інш. Але літаратурныя пошукі празаікаў маладзейшага пакалення мадэляваліся пад ідэйна-эстэтычным уплывам ужо іншага часу, вызначаліся колам новых сацыяльна-маральных праблем.

І. Пташнікаў стаў адным з арыгінальных творцаў на ніве «вясковай прозы», што невыпадкова, бо нарадзіўся і выхаваўся пісьменнік у вясковым асяроддзі, добра ведаў рэаліі, якія пасля сталі асновай многіх твораў. Пачатак творчага шляху І. Пташнікава вылучаўся, з аднаго боку, зваротам да лірычнай, эмацыянальнай «вясковай прозы», а з другога – уплывам беларускай эпічнай традыцыі, якая знайшла яркае ўвасабленне не толькі ў класічных творах нацыянальнай літаратуры, але і ў прозе сучаснікаў Пташнікава – М. Лобана, А. Кулакоўскага, І. Мележа, А. Чарнышэвіча.

Першы твор І. Пташнікава, які ўвайшоў у кнігу апавяданняў і аповесцяў – «Зерне падае не на камень» (1959), выразна акрэслівае адметнасць, актыўнасць творчых пошукаў маладога празаіка. Уважліва, добразычліва прааналізаваў гэты зборнік крытык П. Пастэрнак. Аднак, па нашым меркаванні, даследчык выказаў супярэчлівую думку, папракнуўшы І. Пташнікава за празмернае захапленне «сваім кутком»: «Аўтар прыйшоў у літаратуру са свайго роднага кутка і не змог аб ім змаўчаць. Памог яму “не змаўчаць” К. Чорны. Яго творчасць запаланіла ўяўленні маладога пісьменніка і накіравала яго па асаблівым рэчышчы, якое стала мерай фарміравання “бачання свету”. Але дзякуючы такому пачатку, калі сваё канкрэтнае, блізкае робіцца больш вартым за тое ці іншае “не сваё”, малады аўтар захапіўся жыццём толькі свайго кутка і, як ні дзіўна, гэтым абмежаваў гучанне твораў. Як ні глядзі, як ні расцэньвай, усе ж такі аблюбаваны куток жыцця застаўся “за гарою”. Не вывеў яго аўтар на шырокі свет» [2, с. 29].

Такая ацэнка пачатку творчасці І. Пташнікава бачыцца нам цікавай, бо, з аднаго боку, крытык адчуў і адзначыў асаблівасці таленту пісьменніка, а з другога, відавочна, не да канца зразумеў перспектыўнасць маладога празаіка. Сёння з дакладнасцю можам казаць, што «аблюбаваны куток жыцця» І. Пташнікава не застаўся «за гарою», а ўзняты натхненнем і талентам празаіка якраз «вышэй за горы». У творах Пташнікава чытач адкрывае для сябе лясістую і шматпакутную Лагойшчыну, драматычны лёс трывушчага і духоўна прыгожага яе люду як адметную старонку беларускага мастацкага свету.

З першых крокаў І. Пташнікава ў літаратуру выявілася аўтарская адметнасць і эстэтыка творчага мыслення і светаадчування: да ўсяго варожага чалавеку працы пісьменнік ставіўся адмоўна і бескампрамісна. Станоўчыя ідэалы ён сцвярджаў праз рэзкае адмаўленне зла. Такая пазіцыя патрабавала ад мастака адпаведнага вобразна-стылёвага рашэння. У апавяданнях прасочваецца не проста прыхільнасць пісьменніка да вясковай тэматыкі, але добрае веданне паўсядзённага побыту, звычаяў, псіхалогіі вяскоўцаў, маралі людзей працы. Творы, уключаныя ў першую кнігу, выявілі здольнасць аўтара грунтоўна і ўсебакова паказваць дыялектыку характараў, праўду рэальных абставін. У многіх апавяданнях адчуваецца юнацкая непасрэднасць, рамантычна-ўзнёслае стаўленне да жыцця, а эмацыянальна-метафарычны пейзажны малюнак узмацняе лірызм. Аднак, як слушна сцвярджае даследчыца Т. Нуждзіна, «залішняя акцэнтацыя аўтара на сферы вузка асабістых імкненняў і настрояў персанажаў не магла станоўча адбіцца на ідэйна-мастацкім змесце многіх апавяданняў, якім у першую чаргу не хапіла сацыяльна-філасофскай значнасці і канфліктнай завостранасці» [4, с. 107]. Відавочна, малады празаік яшчэ набываў вопыт сюжэтабудавання, філасофска-аналітычнай манеры пісьма.

У многіх творах І. Пташнікава выразна прасочваліся два пачаткі – прырода і чалавек, і менавіта вакол іх канцэнтравалася ўвага пісьменніка. І гэта было натуральна, бо ён нарадзіўся ў маляўнічых лясных мясцінах і выхоўваўся ў любові да роднай зямлі і працы на ёй. Нездарма ў першых апавяданнях Пташнікава прырода з’яўляецца своеасаблівым фонам. Фонавая функцыя прыроды нават выходзіла на першы план, робячы свет беларускай прыроды натуральным, жывым. Пейзаж у творах маладога празаіка часта выступаў своеасаблівым героем, які мае свой характар, свае думкі, сваё ўспрыняцце тых ці іншых падзей. Прырода часам нават засланяе сабою герояў апавяданняў.

На пачатку пісьменніцкага шляху І. Пташнікаў меў як сваіх прыхільнікаў, так і тых, у каго яго творчасць выклікала спрэчкі. Адны сустрэлі апавяданні пісьменніка добразычліва, другія сумняваліся ў станоўчых аносінах аўтара да жыцця і людзей наогул, бо героямі яго твораў часам былі супярэчлівыя персанажы. Аднак у відавочным таленце пісьменніка не сумняваўся ніхто. А малады аўтар заставаўся верным сабе: рашуча, паслядоўна рабіў крокі, як гэта патрэбна мастаку, асабліва на пачатку творчага шляху, не слухаючы чужыя парады, каб не страціць самога сябе, не страціць уласнае бачанне жыцця, чалавека і свету.

Так, у апавяданні «Смалістая хвоя», напісаным у лірычнай манеры, аўтар знаёміць нас з героем у той час, калі ён ідзе праз лес і вядзе дыялог сам з сабою. Хлопец думае пра Надзю – дзяўчыну, якую кахае, але ніколі яшчэ не гаварыў ёй пра гэта. Здаецца, што свае пачуцці да дзяўчыны ён зразумеў толькі нядаўна, пасля сустрэчы з ёю ў лесе. Яна з нейкай крыўдай спытала, пара яны ці не: «Ходзіш да мяне колькі ўжо, на вечарынках не выпускаеш з рук, на вёсцы толькі пра нас і гавораць… А ты мне нават ні разу не сказаў… Адкуль мне знаць, што ты мяне любіш… Можа ты мне толькі галаву тлуміш» [6, с. 12].

Лёгка заўважыць, што ў асабістым свеце героя зліваюцца два пачаткі – палкасць пачуцця да любай дзяўчыны і чуйнасць да прыроды. Аўтар ужывае прыём унутранага маналогу героя, які суправаджаецца падрабязным апісаннем наваколля, з якім, здаецца, размаўляе герой: «Гляджу на неба. Але навокал лес, а над ім угары – лянівае, гарачае сонца, як кавалак распаленага ў горне жалеза» [6, с. 8].

Як можна пераканацца, свет героя І. Пташнікава прасякнуты непадробнай сапраўднасцю чалавечых пачуццяў. Ён шчыра кахае дзяўчыну, у думках называе яе «мая Надзя». Эмоцыі героя-апавядальніка прасякнуты промнямі дабрыні і веры ў чароўныя, цудадзейныя сілы сапраўднага кахання і неаддзельнай ад яго прыгажосці жыцця. У творы адчуваецца «прысутнасць» аўтара і ў перадачы ўнутранага аблічча галоўнага героя, і ў лірыка-суб'ектыўным, эмацыянальным ладзе стылістыкі твора. Адметная роля ў ацэнцы падзей належыць самому герою – маладому чалавеку, равесніку ўтара, што вызначае наратыўную адметнасць апавядання.

У апавяданні «Бура ўзнялася з начы» пісьменнік імкнецца аб'ектыўна расказаць пра жыццё калгаснай вёскі, не ідэалізуючы сваіх герояў. Перад чытачом разгортваюцца малюнкі штодзённых працоўных спраў вяскоўцаў. Падзеі твора адбываюцца ў святочны дзень, на Троіцу, але надвор'е прадвяшчае буру. У цэнтры твора дзве сюжэтныя лініі: першая – жыццё Амелі на ўласнай зямлі, якую ў яе хочуць адабраць; другая – разгортванне падзей вакол крыжа, які стаіць у канцы вёскі і за якім назірае Аркадзь. Аўтар акцэнтуе ўвагу на вобразе крыжа, апісвае яго: «драўляны, афарбаваны ў блакітны колер» [6, с. 75]. Спачатку крыж стаяў у канцы вёскі, але яна разраслася, і атрымалася, што ён аказаўся якраз пад вокнамі хаты Аркадзя. У канцы твора мы дазнаемся аб тым, што гэты крыж хлопец адвёз на могілкі, вырашыўшы, што там яму месца. Пісьменнік умела апісвае дэталі, трапна перадае эмоцыі галоўных герояў, падкрэслівае рэальную аснову твора, што, на наш погляд, з'яўляецца творчай адметнасцю І. Пташнікава. Пісьменніка прываблівае перш за ўсё чалавек, звычайны працаўнік. Асноўным для сябе Пташнікаў лічыць даследаванне ўнутранага свету героя, выяўленне яго духоўных магчымасцей пры непасрэдным, амаль заўсёды драматычным узаемадзеянні з навакольным светам.

Як ужо зазначалася, важнае месца пісьменнік надае апісанню прыроды. У апавяданні «Бура ўзнялася з начы» прырода адпавядае агульнаму эмацыйнаму настрою, адлюстраванаму ў творы, – трывожнаму чаканню буры. Галоўнае месца займае не само разгортванне падзей, а хутчэй асэнсаванне іх вытокаў, таго, што стварае эмацыйна-рэцыптыўнае поле ўспрымання твора, абумоўлівае прычыннасць з'яў і падзей сюжэта.

Заўважым, што ўжо раннія апавяданні І. Пташнікава вызначаюцца згарманізаванасцю, трапнасцю ўжывання вобразна-выяўленчых сродкаў, сярод якіх значнае месца належыць мастацкай дэталі. І ў апавяданні «Бура ўзнялася з начы» важнай сэнсава-выяўленчай дэталлю з'яўляецца крыж, які, паводле аўтарскай канцэпцыі, сімвалізуе пакуты, трывушчсць і неўміручасць душы працоўнага беларуса.

З першых твораў проза І. Пташнікава вызначаецца апавядальнай адметнасцю, асаблівай здольнасцю аўтара да маляўнічасці, эмацыйна-экспрэсіўнай выразнасці пісьма. У мастака выдатная назіральнасць, востры зрок, тонкі і дакладны слых, якімі ён надзяляе герояў і апавядальніка, наратара. Малюючы прыроду, ствараючы мастацкі характар, пісьменнік імкнецца ўсё заўважыць і перадаць. У яго творах уражвае багацце яркіх, дакладна схопленых, запамінальных падрабязнасцей, абвострана ўвага да непрыкметнага, будзённага.

Апавядальная манера ранніх твораў сведчыла, што пісьменнік умее праз апісанне знешніх дэталяў і рыс трапна і ёміста перадаваць унутраны свет герояў. Гэта пераканаўча зроблена ў апавяданні «Думы Наддацкія», дзе пісьменнік праз апісанне знешнасці герояў перадае не толькі складаную гаму іх пачуццяў, але і несумненны драматызм пражытага: «Ён, шыракаплечы, адразу глянуўшы – няўклюдны, крочыў паволі, змарана, зусім яшчэ малады, хоць яму дваццаць восем. Рукі яго віселі; крыху сагнутыя ў локцях, яны не заўсёды махалі ў такт нагам. Ён быў сур'ёзны, відаць, думаў пра нешта важнае. Яна ішла ззаду. Не размаўляла. Яна была невысокая жанчына, якая памажнела з гадамі. Клятчастая паркалёвенькая хустка ў яе была перакінута праз плячо, за яе нячаплялася багата павуціны разам з сухім лісцем. Русыя валасы, заплеценыя ў слабую касу, адразу кідаліся ў вочы: нагадвалі ручайку льну. Яны пасівелі. Яны – адзнака пражытага» [6, с. 84].

Псіхалагізаваная дэталізацыя ў апісаннях герояў мае значны і глыбокі падтэкст, перадаючы драматызм іх лёсаў, складанасць узаемаадносін. Як бачна з прыкладаў, пісьменнік імкнецца не толькі зрокава намаляваць пэўную карціну, прадмет, сітуацыю, але і даць магчымасць рэцыпіенту ўспрыняць іх нават на слых, пачуць іх пах, адчуць эмацыянальную атмасферу ўзаемастасункаў герояў. Аўтар дакладна перадае рухомасць і зменлівасць навакольнага свету, багацце і разнастайнасць колераў, пахаў, фарбаў. Часта апісанні гэтыя экспрэсіўныя, што выразна выяўляе аўтарскую пазіцыю, канцэптуальнасць твора, імкненне пісьменніка да лірыка-філасофскага асэнсавання жыцця.

«Мне хацелася ісці на край свету, несці яе на руках, змораную, радасную, каханую і слухаць, як стукае сэрца – сэрца маці майго сына!

Сутоньвалася. Вёска пасля жнівеньскага дня рана клалася спаць, і нам у нашых думах ніхто не мог перашкодзіць…

Сустрэчы ў дарозе варажылі мне шчасце» («На шчасце») [6, с. 59].

Непасрэднае выяўленне пачуццяў самога аўтара ці героя-наратара часам пакідала ўражанне, што пісьменнік не так імкнуўся паказаць, тым больш даследаваць жыццё, як выказаць шчыра, адкрыта сваё захапленне навакольным светам, прыродай, радасцю жыцця чалавека.

Прыведзеныя прыклады сведчаць, што ў ранніх творах І. Пташнікава рэалістычная манера дапаўняецца эмацыянальна-лірычнай стылістыкай. Часта апавяданне вядзецца ад імя аўтара-апавядальніка, і яго голас, яго ўдзел у эмацыянальнай афарбоўцы твораў з'яўляецца вызначальным. Асэнсаванне ранніх твораў І. Пташнікава дае падставы гаварыць аб тым, што малады пісьменнік выяўляў голас свайго пакалення, настрой часу ідэйна-грамадскага абнаўлення з уласцівай яму абвостранай увагай да чалавека, народа, свету. Грамадска-культурная сітуацыя ўплывала на станаўленне творчай індывідуальнасці пісьменніка, садзейнічала лірыка-філасофскаму самавыяўленню аўтара і яго герояў.

У ранніх апавяданнях, як паказвае іх аналітычнае даследаванне, пісьменнік часта ўскладняе вобразную структуру твораў і звяртае ўвагу на кожную падрабязнасць. Гэта дапамагае чытачу скласці цэласную карціну, убачыць прадмет, рэч, з'яву такімі, як гэта ўяўляецца пісьменніку. Але пры гэтым І. Пташнікаў нязменна прытрымліваецца прынцыпу вернасці жыццёвай праўдзе. Чытаючы апавяданні, рэцыпіент добра адчувае і бачыць рэальную плынь жыцця, а не толькі яго падзейную, сітуацыйную мадэль. Гэта характарызуе спецыфічнасць апавядальна-творчай манеры І. Пташнікава, адметнасць яго мастацкага стылю.

У прозе пісьменніка поўны і шматгранны вобраз, як правіла, узнікае з шэрагу мастацкіх падрабязнасцей. Героі і падзеі кожнага твора максімальна набліжаны да чытача за кошт глыбокай рэальнасці прадстаўленага пісьменнікам навакольнага свету. Гэта дасягацца часта праз канкрэтыку, менавіта праз увагу да падрабязнасцяў, да дэталі. У апавяданні «Партфель з жоўтай скуры» мастацкая падрабязнасць з'яўляецца важнейшай рысай паэтыкі шэрагу пташнікаўскіх вобразна-выяўленчых сродкаў: «Партфель ляжаў у свіронку. Справа ля дзвярэй. Там дзе ўвязла ў зямлю сячкарня, недалёка ад бітонаў. Ён хутчэй стаяў, бы ладная скрынка з фанеры, прыхаваная пад скуранай накрыўкай, разбухаў. Здаецца, на вачах яго распірала» [6, с. 100].

А вось, напрыклад, якое падрабязнае апісанне вечара дае пісьменнік у гэтым жа творы: «Быў адвячорак, мяккі, лагодны, якія не часта выдаюцца ў студзені. Сонца не відно, але па той смузе, што неяк гусцее ў загуменні, але яшчэ не сцінаецца, угадваеш, што яно яшчэ не зайшло. А смуга ад таго, што на вачах спадае мароз, мякчэе, і ў цішы вечара адчуваеш, што ноччу з-за рэчкі патыхне адлігай» [6, с. 98].

Прыведзеныя апісанні вобразаў-дэталяў, у тым ліку і звязаных з апісаннем прыроды, маюць відавочнае функцыянальнае прызначэнне ў творы. Яны надаюць адметнасць апісанню, кантэкстуальна і псіхалагічна папярэднічаюць пэўным калізіям сюжэту.

Важным складнікам наратыўнай мадэлі і творчай канцэпцыі пісьменніка, як мы ўжо заўважалі, з'яўляецца пейзаж. Пташнікаўскія апісанні прыроды не дадаткі да твора, а, наадварот, цесна звязаныя з асноўным сюжэтам элементы. І нават больш: пейзаж – адзін з герояў твораў. У прыватнасці, у апавяданні «Смалістая хвоя» І. Пташнікаў стварае надзвычай падрабязныя, выпісаныя да дробнай рысачкі малюнкі прыроды. Мы нібы бачым іх уласнымі вачыма, і, несумненна, да стварэння гэтага ўражання імкнецца пісьменнік: «Пад нагамі шуршыць сухі сівы мох і патрэскваюць пакурчаныя ад сонца беленькія палоскі смалістай хвоі, якіх багата наstругала наведзеная асялком стамеска падсочніка» [6, с. 5]. Мастацкі свет, які тут стварае пісьменнік, як і ў некаторых іншых ранніх творах (напрыклад «Партфель з жоўтай скуры»), не мае строгай сюжэтна-кампазіцыйнай завершанасці, падпарадкаванасці нейкай асноўнай зададзенай ідэі. Ёсць жыццё ці пэўная жыццёвая сітуацыя, у якой выяўляецца лёс чалавека. Свет, створаны сілай мастацкага таленту І. Пташнікава, атрымліваецца цэласным, выразным, эстэтычна прывабным.

У апавяданні «На шляху луг» пісьменнік знаёміць нас з маладым чалавекам, які атрымаў ліст ад каханай дзяўчыны Галі і даведваўся, што яна хоча закончыць адносіны з ім. У цэнтры твора – унутраныя разважанні, успаміны, эмоцыі, думкі маладога чалавека. У творы пераважае менавіта эмацыянальнае ўспрыняцце жыцця героем. Зусім відавочна, што ўспаміны і думкі-маналогі герояў – адзін з вядучых творчых прыёмаў І. Пташнікава. Гэта дапамагае аўтару раскрыць псіхалагічна-эмацыянальныя вытокі калізій і канфліктаў герояў, асэнсаваць і ацаніць тое, што было ў іх жыцці. Адчуваецца пэўная аўтабіяграфічнасць твора. Вобразам апавядальніка, пазіцыяй і характарам асобы, ад імя якой ідзе гаворка, вызначаецца і стылістыка твора. Гэта, па сутнасці, тое, што многія пісьменнікі і даследчыкі літаратуры называюць асноўным тонам твора. Верагодна, пачуцці героя, якія аўтар апісвае, ён перажыў у юнацтве і сам, таму яму ўдалося так дакладна, канкрэтна і па-мастацку пераканаўча перадаць іх: «Але гэта я толькі

думаю. У думках я смелы. Гатоў цябе падняць на рукі, несці, туліць, цалаваць. Я нават адчуваю, якая ты лёгкая-лёгкая, бо я дужы і, мусіць, ужо мужчына. Толькі як сказаць табе пра гэта, калі ад наплыву нейкай цеплыні ў мяне прыкушаны язык? Не, я ніколі не быў смелы. Я хачу, каб гэта зрабіла ты» [6, с. 33]. Па гэтым невялікім фрагменце бачна, як многа эмоцый, перажыванняў аўтар уклаў у свет пачуццяў свайго героя.

Амаль у кожным радку сустракаецца асабісты займеннік *я*, што падкрэслівае эмацыйную напружанасць стану і адкрытасць выяўлення ўнутранага свету галоўнага героя. Узнікае лірыка-псіхалагічны эфект успрыняцця і гучання маналогу героя. Чытач незаўважна прагаворвае яго разам з героем і як бы далучаецца да думак, эмоцый апавядальніка («я думаю, я адчуваю, я хачу»). Твор мае рэтраспектыўную мастацкую прастору: вялікая ўвага надаецца ўспамінам і разважанням героя. Яго ўнутраны маналог суправаджаецца апісаннем навакольнага свету: «Неяк мімаходзь я зірнуў удалеч. Сонца ўжо збіралася заходзіць за лес, яно вісела там, удалечыні над цёмнымі выгібамі векавечных яловых град, чыстае, цяжкае; намарылася за доўгі вясновы дзень. З лагчын і беразнякоў на луг наплываў рэдкі, нясмелы туман, але я ведаў, што нават за тры крокі не заўважыш лісця на бярозах. На захадзе, за вёскай вісела сінеча. Там – шаша» [6, с. 33]. І потым аўтар зноў вяртаецца да героя і яго перажаванняў: «Цябе, цябе знайшоў я… Толькі сёння, цяпер… Праз усе свае школьныя гады. Мне цяжка пакінуць… Я люблю…» [6, с. 33]. Такія пераходы ад рэтраспектыўнага апісання да сучасных падзей у жыцці героя сустракаюцца амаль ва ўсіх ранніх апавяданнях І. Пташнікава, вызначаючы іх наратыўна-стылёвую спецыфіку.

Адметна вырашаецца І. Пташнікавым і канцэпцыя героя. Ужо з першых апавяданняў узнікае ўражанне, што перад намі гатовыя характары, якія сфарміраваліся недзе раней, яшчэ за старонкамі твораў, а ўжо зараз, праз сюжэтныя падзеі, героі выяўляюць сваю сутнасць. Несумненна, што пісьменнік клапоціцца пра тое, каб чытач адчуваў праўдзівасць, натуральнасць герояў. І гэты клопат уяўляецца нам зразумелым у кантэксце часу, які патрабаваў ад мастакоў шчырасці, праўдзівасці, бо ў 1950-я гг. на старонках літаратурных твораў сустракалася нямала надуманых «штучных» герояў. Пташнікаў – пісьменнік з рэальнымі поглядамі на жыццё, які імкнуўся наблізіцца да жывой, «натуральнай» яго плыні.

Некаторыя даследчыкі часта папракалі пісьменніка за празмерную апісальнасць у ранніх творах. Сапраўды, падрабязныя, дэталёвыя малюнкі і апісанні – гэта выразная адметнасць творчасці І. Пташнікава. Але ў гэтым нам сёння бачыцца неаспрэчная каштоўнасць і адметнасць прозы пісьменніка.

Адзначым, што раннія творы насычаны вобразнымі параўнаннямі, дакладнымі і яскравымі апісаннямі прыроды, ёмстымі дэталямі-характарыстыкамі персанажаў. Аднак яны не ствараюць уражанне перанагружанасці тэксту. Дэталізаваная інфармацыя, на наш погляд, накіравана на цэласнае і паўнавартаснае адлюстраванне чалавека, свету і грамадства. Гэта яшчэ адна наратыўная адметнасць творчасці празаіка. Кожнае параўнанне ці апісанне выконвае ў апавядальнай плыні сваю выяўленча-стылістычную функцыю. І. Пташнікаў намагаецца задзейнічаць у структуры тэксту нават дэталі. З дапамогай іх аўтар выклікае ў чытача неабходныя эмоцыі і асацыяцыі, пераканаўча перадае рэцыпіенту сваю карціну свету і ідэйна-філасофскую пазіцыю. Так, напрыклад, выразна зычлівыя адносіны аўтара да героя перадае наступнае партрэтнае апісанне («Асенняе апавяданне»): «Твар яго то ўсплываў часам так блізка, што яна бачыла маршчынкі на ілбе і пераноссі, то раптам знікаў, губляўся. Толькі добра помнілася, што твар горды. І ці не прамы нос рабіў яго такім? Не. Хутчэй падбародак – востры і раздвоены. А вочы? Мусіць, шэрыя і разумныя. І часта загараліся. Памяць яшчэ хавала чамусьці ямачкі, якія былі, бадай, лішнія на яго шчоках: рабілі твар мяккім, зусім жаночым, калі хлопец размаўляў ці ўсміхаўся» [6, с. 39].

У дадзеным выпадку пісьменнік не падае аб’ектыўна-рэалістычнае апісанне, а аблічча героя прыгадваецца праз успаміны гераіні. Праз дэталі знешнасці мы прачытваем вобраз-характар, спасцігаем адносіны гераіні да яго. Рэцыпіенту зразумела, чаму твар у героя, напрыклад, «горды», вочы не толькі «шэрыя», але і «разумныя».

Маленства, абпаленае вайной, абумовіла зварот І. Пташнікава ў ранні перыяд і да гэтай тэмы. Безумоўна, вайна і драматычны пасляваенны час аказалі вялікі ўплыў на лёс і творчае станаўленне пісьменніка, на выспяванне задум, на эстэтычнае ўвасабленне высокіх маральных крытэрыяў, што паслядоўна выявіліся ў творчасці ўсяго пакалення «дзяцей вайны». У прыватнасці, у апавяданні «Зломаны крыж» падзеі мінулых гадоў аўтар перадае праз успаміны сталага Палянскага, які апавядае пра жудасныя часы вайны. Дзеянне ў апавяданні ахоплівае некалькі часавых пластоў, а ўспаміны героя значна пашыраюць прастора-часавыя рамкі, знаёмяць з іншымі героямі – жыхарамі беларускай вёскі. Менавіта праз прызму бачання галоўнага героя, праз адчуванне болю, ад якога ўжо многа гадоў шчыміць сэрца старога пры згадаках пра мінулае, у творы паглыбляюцца эмацыянальнасць і філасафізм. Трагічныя падзеі, пра якія ўспамінае стары, адбываюцца на Вялікдзень 1943 г. Гэты экскурс у мінулае дазваляе чытачу больш дакладна зразумець сутнасць перажыванняў героя-наратара на сучасным этапе яго жыцця. У яго сваё адчуванне і разуменне рэчаіснасці. У гэтых успамінах усё псіхалагічна натуральна і верагодна, па-мастацку падпарадкавана раскрыццю і сцвярджэнню думкі пра дзікунствы фашызму, у якім бы абліччы ён не выступаў. Агульная трагедыя складаецца з трагедый індывідуальных. Трагедыя вайны і трагедыя старога Палянскага – гэта не абстракцыя. За ўспамінамі – смерць яго сыноў, смерць іншых дзяцей, бацькоў, смерць людзей. Вайна ў І. Пташнікава – гэта страшэннае парушэнне свету, у якім усё яшчэ жывуць яго героі. У творы выразна бачыцца імкненне аўтара выказаць праз збалелую памяць героя гуманістычны пратэст супраць вайны і чалавеказабойства.

Аўтар спрабуе праз сюжэтныя падзеі і з дапамогай пейзажнай замалёўкі, а таксама праз падрабязнае апісанне паказаць чытачу драматычны свет героя твора: «Гэта быў стары Палянскі з нашай вёскі… ён яшчэ быў даволі рухавы. Сівыя валасы выбіваліся з-пад чорнай шапкі… Яны (вочы – *В. Б.*) серабрыліся на сонцы, як і яго валасы, як і барада, як і сам ён увесь» [6, с. 62].

Важнае месца ў гэтым творы займае эмацыянальна насычаная карціна прыроды: «Зямля была яшчэ сырая, але ўжо цёплая. Чырванела каля канаў на нашай грэблі крапіва, і над дрывотнямі камары таўклі мак. Вёска была ціхая і свежая. Шумела рака, і над ёю нагіналіся лозы ў срэбна-шэрых катках… Набухлі пад вокнамі пупышкі на тапалі і бэзе» [6, с. 63]. Прырода ў творы – неад’емная частка людскога існавання. Тую гісторыю, пра якую расказвае наратар, нельга ўявіць без палявых пыльных дарог, без неба. Героі пісьменніка жывуць у беларускай прыродзе, ёю народжаны і абумоўлены іх быццё і нават характары. Менавіта прырода дае адчуванне гармоніі героям І. Пташнікава, яна – невычэрпная крыніца іх жыццёвай сілы і трываласці.

Антываенны пафас апавядання, узноўленая трагедыя спаленых разам з людзьмі вёсак, сведчыць пра тое, што вайна пакінула ў душы пісьменніка, як і ўсяго народа, балючы і незагоены след.

Паказваючы жыццё родных мясцін, прыроду роднага краю, І. Пташнікаў выразна выяўляе любоў і захапленне тым, аб чым піша. Героі пісьменніка жывуць на адной з ім зямлі. Край гэты дарагі, і родны для пісьменніка.

**Заключэнне**

Ужо ў першай кнізе І. Пташнікава бачыцца імкненне аўтара да прыёмаў псіхалагічнага аналізу, да адлюстравання багацця фарбаў і гукаў, ўзнаўлення жывых галасоў прыроды, стылявой экспрэсіі ў выяўленні жыцця асобы, свету і ўласнай творчай пазі-

цыі. Пісьменнік свядома ўскладняе вобразную структуру твораў і звяртае ўвагу на кожную падрабязнасць. Гэта дапамагае скласці цэласную карціну свету, убачыць прадмет, рэч, з'яву ў адпаведнасці з творча-эстэтычнымі задачамі, што выразна выяўляе спецыфічнасць творчай манеры І. Пташнікава, адметнасць яго стылю.

Як можна пераканацца, ужо ў пачатку творчага шляху І. Пташнікаў знайшоў сябе і даказаў права на свой стыль, адметную наратыўную манеру. Яго тыповыя героі былі выразнымі носьбітамі аўтарскага маральна-гуманістычнага бачання жыцця, у тым ліку і падзей мінулай вайны. Раннія апавяданні з'яўляюцца вынікам удумлівых пошукаў уласнага творчага шляху, свайго пісьменніцкага «голасу» і бачання жыцця.

У апавяданнях 1950-х гг. І. Пташнікаў паказаў чалавека пераважна ў жыцці сацыяльна-бытавым, а праз гэтае жыццё – у самых цесных дачыненнях з прыродай. У творах бачыцца несумненная таленавітасць пісьменніка, здольнасць па-свойму асэнсоўваць і маляваць жыццё. Выключная назіральнась, няспыннае імкненне пранікнуць у глыбіні жыцця і чалавечых характараў, мэтанакіраваныя пошукі самога сябе абумовілі пісьменніцкую індывідуальнасць: і ў жанравай адметнасці лірыка-псіхалагічнага апавядання, і ў наратыўнай спецыфіцы, і ў ідэйна-філасофскім і эмацыянальным напаўненні канцэпцыі героя, і ў прыёмах стварэння характараў. Манера апавядання пры ўсёй эмацыянальна-лірычнай напоўненасці пераважна апісальныя, што абумовіла і прынцып стварэння мастацкіх вобразаў: сацыяльны і бытавы змест не засланяе духоўную і маральную сутнасць героя, калі чалавек і навакольны свет знаходзяцца ў стане гарманічнага суіснавання і ўзаемадзеяння.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Андраюк, С. Прадыктавана жыццём, праверана часам / С. Андраюк // Полымя. – 2012. – № 10. – С. 155–168.
2. Андраюк, С. Чалавек на зямлі / С. Андраюк. – Мінск : Маст. літ., 1998. – 252 с.
3. Гарадніцкі, Я. А. Мастацкі свет беларускай літаратуры XX стагоддзя / Я. А. Гарадніцкі. – Мінск : Беларус. навука, 2005. – 171 с.
4. Нуждзіна, Т. Дарога ў сталасць / Т. Нуждзіна // На высокай хвалі : літ.-крыт. арт. / пад рэд. Д. Я. Бугаёва. – Мінск : Нар. асвета, 1980. – 107 с.
5. Палтаран, В. Чалавек на вярхах часу / В. Палтаран. – Мінск : Маст. літ., 1989. – С. 248–283.
6. Пташнікаў, І. Зерне падае не на камень / І. Пташнікаў. – Мінск, 1959. – 258 с.
7. Шамякіна, Т. На лініі перасячэння : літ.-крыт. нататкі / Т. Шамякіна. – Мінск : Маст. літ., 1981. – 143 с.

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 23.11.2018

***Budnik V.A.*** **The Stories of the 50-s by I. Ptashnikov: the Concept of Hero, Narrative Features**

*The development of artistic individuality of the writer is associated with the genre of the story, which enabled I. Ptashnikov to concentrate his attention on one character, deeply and fully reveal his internal world. The use of internal monologue, experienced speech, artistic details, expressive character's and narrator's expressivity define the narrative features of I. Ptashnikov.*